*Юлія Курыленка*

# СІМВОЛІКА ЛАБІРЫНТА Ў ЕЎРАПЕЙСКАЙ КУЛЬТУРЫ

> *«Жыццё кожнага чалавека – лабірынт, у цэнтры якога знаходзіцца смерць. Перад тым, як канчаткова перапыняецца існаванне, чалавек праходзіць свой апошні лабірынт».*
>
> *Майкл Эртан*

На зямлі, мусіць, няма больш загадкавай пабудовы, чым лабірынт. Ён прываблівае, заблытвае, нават палохае і можа давесці да адчаю тых, хто апынаецца ў ім. Нездарма столькі легенд і міфаў узнікла вакол гэтай архітэктурнай загадкі.

Дзякуючы сваёй загадкавасці і таямнічасці, лабірынт ужо даўно стаў своеасаблівым сімвалам у сусветнай культуры. Аднак у кожнай культуры лабірынт сімвалізуе нешта сваё, адметнае. Дарэчы, семантыка слова «сімвал» (грэч. symbolon – умоўны знак, symballein – злучэнне) абазначае мастацкі вобраз, які ўвасабляе якую-небудзь ідэю, тое, што служыць умоўным знакам якога-небудзь паняцця, з'явы, адзін з відаў паэтычнага іншасказання, умоўнае абазначэнне сутнасці якой-небудзь з'явы [2, *23*]. Пераносны сэнс сімвала пачынае замацоўвацца з традыцыі разбіваць гліняную таблічку ў знак заключэння якой-небудзь згоды або пагаднення: кожнаму з удзельнікаў давяралі адзін кавалак разбітай таблічкі, каб пры злучэнні гэтыя фрагменты маглі скласці адзінае цэлае, як часткі мазаікі [4, *6*]. Частка такой таблічкі, якая належала аднаму з удзельнікаў, мела назву symbola. У дадзеным кантэксце сімвал не толькі ўвасабляе што-небудзь, але і ўказвае на адсутнасць нейкай нябачнай часткі, неабходнай для ўзнаўлення адзінага цэлага.

Старажытным корнем слова «лабірынт» з'яўляецца слова «ла» (камень), у значэнні «штосьці цвёрдае». Labrys – гэта двухгаловая сякера з вострава Крыт, у якой выгнутае лязо знаходзіцца з абодвух бакоў і сімвалізуе месяц, які і ўбывае і адначасова прыбывае. У сярэдзіне кожнага ляза сякеры знаходзіцца крыж. Такую сякеру звычайна трымае багіня, якая стаіць каля ўвахода ў лабірынт ці падземны свет [4, *148*].

Лабірынт можа мець адзін шлях са шматлікімі паваротамі, які прыводзіць да цэнтра. Альбо лабірынт складаецца з некалькіх шляхоў, толькі адзін з іх прывядзе да цэнтра, а астатнія вядуць у тупікі. У першым выпадку можна згубіцца, страціць арыентацыю, а ў другім – адчуць разгубленасць, прыгнечанасць. Самым простым відам лабірынта з'яўляецца лабірынт з трыма віткамі, але найбольш распаўсюджаны лабірынт класічны, або крыцкі, з сям'ю віткамі. У ім часцей за ўсё адзін уваход і адзіны праход да цэнтра. Ён можа мець форму кола, а таксама квадрата.

Дзякуючы міфу аб Мінатаўры, уяўленне пра лабірынт атрымала вялікую папулярнасць у еўрапейскай культуры, дзе і набыло больш шырокі

алегарычны і сімвалічны сэнс (самапазнання, пераадольвання ў сабе жывёльных інстынктаў, пераходу праз смерць да адраджэння). Нягледзячы на гэта, кожны народ меў сваю асабістую трактоўку сімвала, часцей за ўсё блізкую да еўрапейскай. У легендзе пра Мінатаўра прысутнічаюць найбольш важныя моманты: спуск у лабірынт, страта арыентацыі ў дарозе, сустрэча з ўнутраным зверам-страшыдлам і яго забойства, выхад з лабірынта пры дапамозе ніці, якая сімвалізуе ніць жыцця і ажыццяўляе сувязь паміж верхнім і ніжнім светамі і свядомасцю.

Узнікненне лабірынта як тыпу пабудовы адбылося яшчэ ў старажытнасці. У Егіпце і Этрурыі іх будавалі ў якасці перасцярогі ад рабавання пахаванняў. Так, напрыклад, сусветна вядомыя піраміды Хеопса, Хефрэна і Мітэрына былі разрабаваны яшчэ ў старажытнасці, таму што яны былі ўзведзены без выкарыстання лабірынту. У той жа час існавала павер’е, што душы памерлых і жывых не могуць выбрацца з безвыходнай сітуацыі лабірынта. Гэта дае падставу лічыць, што лабірынт як быццам выпрабоўваў настойлівасць і цярплівасць людзей, прымушаючы іх яшчэ раз зрабіць спробу знайсці выйсце або застацца ў ім назаўсёды.

У «Гісторыі» Герадота расказваецца пра пяць вялікіх лабірынтаў старажытнасці: у Егіпце, каля возера Маерыс, які налічваў прыкладна 3000 пастак і 12 тупікоў; яшчэ два знаходзіліся ў Кносе і Гартане, а астатнія – у Грэцыі. Самы старажытны з іх датуецца прыкладна V ст. да н. э. Ён быў пабудаваны 12 царамі ў якасці мемарыяльнага комплексу на беразе штучнага возера. Піраміда вырастала з адной сцяны лабірынта і мела верхні ўзровень і ніжні, падземны, у якім знаходзіліся ўсыпальніцы 12 цароў і сакральных кракадзілаў [3, *65* ].

Рымляне прыдумалі лабірынты са звілістымі, спіралевіднымі і серпанцінавымі праходамі, робячы іх ў выглядзе ўзора, малюнка на мазаікавых падлогах і сценах. Пазней гэтыя ўзоры былі прыняты царквой. Так, самы старажытны ўзор датуецца IV ст. н. э. (зараз ён знаходзіцца на тэрыторыі Алжыра) [4, *148* ].

Паводле ўяўленняў шумераў, лабірынт – гэта «штучнае перайманне ніжэйшага свету». У народаў Акеяніі ён сімвалізуе шлях, па якім душа вандруе ў царства мёртвых, у Індыі лічыцца сімвалам медытацыі, засяроджанасці, вяртання да сваёй сутнасці [3, *66* ].

У некаторых іншых культурных традыцыях, напрыклад у крыта-мікенскай культуры, лабірынт з’яўляецца сімвалам сусвету, космасу. Стварэнне лабірынтаў у Англіі прыпісвалася друідам, у Швецыі і Нарвегіі – гномам і тролям. Па некаторых паданнях каменныя лабірынты будавалі веліканы, таму і сёння іх называюць «шляхамі веліканаў». Лічылася, што феі танцуюць у святле месяца на гэтых каменных спіралях і менавіта адсюль з’явіліся гномы, тролі і іншыя насельнікі таямнічага свету [3, *67* ].

У Паўночнай Еўропе лабірынты звязваліся з падземным светам і з’яўляліся своеасаблівымі ўваходамі ў яго, месцамі сутыкнення розных рэальнасцяў, сімвалізуючы пры гэтым сам іншасвет. Так, карэльскія і

беламорскія лабірынты ўяўляюць сабой выявы скручаных змей падземнага свету [3, *67* ].

А яшчэ ён увасабляе сабой разнастайнасць праблем, пытанняў і складанасцей выбару правільнаг рашэння, ідэю пошука чалавекам ісціны, кругаварот жыцця, смерці і наступнага аднаўлення. Бесперапынная лінія ў лабірынце сімвалізавала сабой бессмяротнасць і вечнасць. Лабірынт, які малявалі на доме, лічыўся абярэгам ад злых духаў.

У той жа час салярная сімволіка лабірынта, якая выражаецца праз спіралевіднасць і крыжападабенства ліній, на нашу думку, магла быць звязана з культам Сонца, з міфамі аб яго ўтрымліванні злымі сіламі ў скале ці гары падземнага свету. Тут лабірынт увасабляе сабой рух Сонца, яго ўзыход і заход, вясенняе вызваленне пасля зімовага палону.

Дарэчы, сімвалізм лабірынта даволі трывала ўвайшоў і ў хрысціянскую культуру. Аднак цэнтр лабірынта ў хрысціянстве набывае зусім іншы сэнс – ён азначае выратаванне. А ў эпоху сярэднявечча манахі таксама праходзілі па царкоўным лабірынце пад час рэлігійных разважанняў. Выявы лабірынтаў сустракаюцца ў сярэднявечных храмах Італіі, Францыі, Швецыі. Так, лабірынт на падлозе сабора горада Фарлі (Францыя) сімвалізуе «шлях у Іерусалім»: прапаўзаючы яго на каленях, вернікі нібы здзяйснялі паломніцтва да святых месцаў. Вядомы яшчэ лабірынт у Шартры, які быў пабудаваны ў 1230 г. Ён мае выгляд кветкі з шасцю пялёсткамі ў цэнтры і сімвалізуе зліццё энергій: мужчынскай (Хрыстос) і жаночай (Дзева Марыя) [3, *68* ].

У хрысціянскай літаратуры лабірынт тлумачыцца па-рознаму: як цяжкасці і расчараванні на шляху хрысціяніна ў зямным свеце, як грахоўная сутнасць чалавека, якая не дазваляе яму ісці прамой дарогай, як сімвал паломніцтва душы на нябёсы і як хвілёвы шлях чалавека, што мінае грахоўныя пасткі. Лабірынты, якія выяўляліся на сценах храмаў, маглі ў той жа час сімвалізаваць шлях Хрыста на Галгофу.

З эпохі Рэнесанса вобраз лабірынта пранікае і ў паркавую архітэктуру, дзе паступова пераўтвараецца ў амаль абавязковы забаўляльны элемент, які тым самым зніжае старажытную сутнасць сімвала.

Пазней лабірынты ідэальна ўпісаліся ў эстэтыку барочных садоў. Не грэбавалі імі і ў рамантычных парках, дзе іх уладкоўвалі сярод падстрыжаных кустарнікаў і траў. Пры гэтым, лабірынт не страчваў сваіх сімвалічных значэнняў, працягваючы ўвасабляць праблему выбара, бясконцасць, таямніцу і ўдачу. Ці не таму ў зялёных лабірынтах любілі хавацца філосафы і закаханыя?

На нашу думку, лабірынт сімвалічна звязаны са шляхам. Працэс блукання ў лабірынце – гэта зменлівы стан чалавека, якому заўсёды трэба рабіць высновы, прымаць рашэнні, вызначаць свой далейшы жыццёвы шлях.

Такім чынам, лабірынт – гэта вельмі важны сімвал, які інтэрпрэтаваўся па-рознаму, у залежнасці ад духоўных і псіхалагічных пошукаў канкрэтнай культуры. Ён убірае ў сябе творчую і рытуальную прастору, якая адлюстроўвае ўспрыняцце невядомасці ў той час, калі ідзе працэс пераадольвання цяжкасцяў на жыццёвым шляху.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Дубянецкі Э. С.* Культуралогія: Энцыклапед. даведнік. Мн., 2003.
2. *Рагойша В. П.* Паэтычны слоўнік. Мн., 1979.
3. Символы и знаки / сб.статей / ред.: Т. Каширина, Т. Евсеева. М., 2006.
4. Символы и знаки / иллюстрированная энциклопедия / сост. М. О’Коннелл, Р. Эйри. М., 2008.
5. Энциклопедия символов / сост. Л. С. Баешко, А. Н. Гордиенко. М., 2007.